ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗА СТАЛІНСКІЯ КАДРЫ

Чацвер
18 сакавіка 1954 г.

Орган рэктарата, партбюро, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома
Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна.

№ 5 (191)
Цана 20 кап.

А. ХАРКЕВИЧ

В ЭТОТ ДЕНЬ

Вокруг меня, как на ладони,—
Столица в россыпи огней.
Еще трамваи не трезвонят,
Но день уже стучится к ней.

И звезды, словно часовые,
мерцают,
охраняя Русь.
Не досмотрел сегодня сны я,
Зато на город нагляжусь!

Неповторимые мгновенья
Дарит мне утренняя высь.
А ветерок
такой весенний,
Что хоть возьми да расстегнись.
И пусть цветов покуда нету,
И даже
не взошла трава,
Но за весну—красу планеты—
Я в две руки б
Голосовал!

. . . Мысль отгадав мою
как будто,
качнулась стрелка на шести.
И на какую-то минуту
Зал переполненный притих.

И на пороге счастьем встречен,
Входил, как праздник, этот
день.
. . . Уже торжественно
отмечен
И выдан первый бюллетень.
Уже народ подходит к урнам...

И вдруг,
прорезав стаи туч,
Ворвался с вышины лазурной
Веселый, золотистый луч.

И все вокруг заулыбалось.
Весна ворвалась в людный зал
И сердце мне о том сказало—
Я вместе с ней голосовал!

За Партию,
За счастье края,
За дружбу с той,
что друга ждет,
За тех,
кто пашет на Алтае,
За тех, кто землю бережет!

ЗА ШЧАСЦЕ РАДЗІМЫ

Вялікае ўсенароднае свята! Мы, работнікі Мінскага чыгуначнага вузла Беларускай чыгункі, як і ўсе савецкія людзі, рыхтаваліся да выбараў у Вярхоўны Совет СССР з вялікім уздымам.

За час перадвыбарчай кампаніі машыністы-пяцісотнікі правялі звыш 550 цяжкавагавых саставаў, перавезлі дадаткова 150 тысяч тон народнагаспадарчых грузаў. З асаблівым энтузіязмам працавалі чыгуначнікі ў апошнія дні перад выбарамі. 13 сакавіка яны правялі вялікую колькасць цяжкавагавых саставаў і перавезлі звыш нормы больш 5 тысяч грузаў. Выдатныя рэйсы зрабілі машыністы тт. Усцінаў, Саладкоў, Баранаў і другія. Механік тав. Кузнецоў правёў на высокай хуткасці поезд, вага якога амаль у два разы перавышала норму. Стаханаўцы вузла за гэты час ўфарміравалі хуткаснымі метадамі больш 1500 таварных паяздоў, што значна паскорыла абарот вагона.

Калектыў нашай дыспетчарскай змены, змагаючыся за выкананне абавязацельстваў, узятых у чэсць выбараў, дабіўся значнага перавыканання эксплуатацыйных вымяральнікаў. 9 сакавіка мы сумелі звыш плана пагрузіць 100 вагонаў і выгрузілі 50. Напярэдадні выбараў мы закончылі пагрузку састава аўтамашын на станцыі Сцяпянка, прызначаных для народнай гаспадаркі.

Мы і наперад, не шкадуючы сіл, будзем змагацца за ператварэнне ў жыццё праграмы партыі і ўрада па далейшаму ўздыму матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця нашага народа, бо бачым у гэтай праграме адлюстраванне сваіх кроўных інтарэсаў і думак. Вось пагэтаму мы ў дзень выбараў з радасцю аддаем свае галасы за дастойных сыноў і дачок нашай любімай Радзімы.

П. СУДНІКАЎ,
дзяжурны па Мінскаму аддзяленню Беларускай чыгункі.

Шчырыя пачуцці

Сёлета мне споўнілася восемнаццаць год. Першы раз у жыцці я ўдзельнічала ў выбарах.

Колькі самых цёплых думак, самых шчырых пачуццяў звязана ў савецкіх людзей з гэтым вялікім усенародным святам! Кожны з нас галасаваў у гэты дзень з пачуццём глыбокай удзячнасці роднай Камуністычнай партыі і Савецкаму ўраду за іх бацькоўскія клопаты аб добрабыце свайго народа.

З асабліва вялікай любоўю і цеплынёй думала я ў гэты ўрачысты і незабыўны для мяне дзень аб ёй, Радзіме! Гэта яна замяніла мне роднага бацьку, якога я страціла ў суровыя годы Вялікай Айчыннай вайны. Гэта яна ласкавай маці гасцінна адкрыла перада мной шырокі шлях у навуку. Іменна ёй, маці Радзіме, абавязана я тым, што з поўным правам і пачуццём вялікай гордасці за наш савецкі народ я магу, як і тысячы другіх дзяўчат і юнакоў, назваць дзень выбараў радасным, урачыстым, незабыўным днём.

Як цяжка ўсведаміць сёння, што ў гэты час мільёны юнакоў і дзяўчат у краінах капітала вымушаны заваёўваць права на сваё сучаснае і будучае ў жорсткай і бязлітаснай барацьбе з чорнымі сіламі імперыялістычнай рэакцыі. Заправілы гэтых краін імкнуцца зараз распаліць новую сусветную бойню. Хочацца крыкнуць ім, што простыя людзі свету не дапусцяць гэтага, што ніколі не ажыццявіцца іх крывавым планам.

Я шчаслива, што, выбіраючы ў вярхоўны орган улады лепшых людзей маёй вялікай Радзімы, я далучыла свой голас да галасоў шматмільённай арміі барацьбітоў за мір, за вялікае будучае ўсіх людзей свету.

Н. НАТОЧЫЙ,
студэнтка I курса гістарычнага факультэта.

УСЕНАРОДНАЕ СВЯТА



У ліку першых прагаласавалі студэнткі нашага універсітэта. На здымку (злева направа): студэнткі Н. Хох, Г. Дземянцэвіч і З. Курыленка каля выбарчай урны.

Фота Б. Брэйва і Р. Ясінскага

— А ўсё-ж прызнайся, Валя, што і ты зайздросціла старэйшым, калі яны збіраліся на выбарчы ўчастак. Праўда? Сёння-ж самі галасуем... Упершыню. Радасна, і разам з тым сэрца неяк замірае, — звярнулася Зіна Курыленка да сяброўкі. Дзве дзяўчыны, падобныя адна да другой сваёй маладосцю, бесклапотным вы разам ззяючых шчасцем вачэй, разам увайшлі ў вестыбюль. Побач іх праходзяць рабочыя, служачыя, студэнты, чыгуначнікі — людзі розных прафесій.

Куранты па радыё прабілі шэсць. Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі тав. [illegible]мчык віншуе сабраўшыхся з вялікім святам. Затым слова бярэ адзін са старэйшых выбаршчыкаў, удзельнік паўстання на броненосцы «Пацёмкін» Павел Віктаравіч Галубовіч.

— Сёння, — гаворыць ён,— я з вялікай радасцю аддам свой голас за кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных, за таварышаў Сабурава і Длугашэўскага. Я галасую за тое, за што калісьці змагаўся на броненосцы «Пацёмкін», — за шчаслівае жыццё.

Усхвалявана, молада, задорна гучыць голас студэнткі першага курса аддзялення геалогіі Галіны Дземянцэвіч:

— Сёння асабліва радасна ў мяне на душы. Я галасую за светлае, шчаслівае жыццё совецкай моладзі, за працвітанне нашай любімай Радзімы, за мір паміж народамі ўсёй зямлі.

Хатняя гаспадыня Марыя Аляксееўна Прохарава заклікае ўсіх выбаршчыкаў аддаць свае галасы за кандыдатаў у дэпутаты ў Вярхоўны Совет СССР.

Аб'яўляецца пачатак галасавання. Велічна гучыць Дзяржаўны гімн Совецкага Саюза.

У ліку першых атрымоўваюць бюлетэні першакурсніцы філалагічнага факультэта Зіна Курыленка і Валя Лемцюгова. Беражна, як вялікі скарб, яны нясуць іх да выбарчай урны — першыя бюлетэні ў жыцці. Рукі злёгку дрыжаць ад хвалявання, і неслухмяныя паперы не адразу трапляюць у шчыліну урны. Зіна, адыходзячы, яшчэ раз, зірнула на залітую святлом, у зелені вазонаў і чырвані сцягоў залу, на партрэты дарагіх правадыроў.

— Як хораша! Гэты ранак запомніцца назаўсёды.

А па нядаўна насланай паркетам падлозе ішлі і ішлі выбаршчыкі. Галасуе знатны чыгуначнік Павел Дзмітрыевіч Суднікаў і былы камандзір партызанскага злучэння Савелій Герасімавіч Сідарэнка. Сівая жанчына нясе на руках бялявую дзяўчынку. Гэта за яе будучае апускае яна свой бюлетэнь. Да дзевяці гадзін раніцы прагаласавала звыш 80 працэнтаў выбаршчыкаў. Прагаласавалі і ўсе 14 жыхароў дома № 6 па вуліцы 11 ліпеня, якія быці замацаваны за агітатарам Ірай Елінскай, студэнткай I курса гістарычнага факультэта.

— Ну, вельмі дзякую, дарагая, за цікавыя гутаркі,—звяртаецца да яе хатняя гаспадыня Свістунова,— заходзьце да нас і пасля выбараў, пачытаць газету, а то і проста папіць чайку.

—А вы цяпер зайдзіце ў наш клуб. Там пачынаецца канцэрт мастацкай самадзейнасці.

І праз некалькі хвілін Іра сцяваецца разам з факультэцкім хорам песні «Голуб міру». Хор змяняюць салісты Нікалай Паўлючкаў і Сяргей Дзерэшаў. Сатырычныя творы чытаюць Мурнеў і Герасіменка. Горача апладыруе ім разам з гледачамі Анна Аляксандраўна Свістунова.

— Малайцы. Добра выступалі. Як сапраўдныя артысты, — гаворыцца яна на развітанне свайму агітатару.

Выбаршчыкі Варфаламеева і Таміцкая горача дзякавалі агітатарам Галіну Васкабойнікаву, студэнтку I курса аддзялення філасофіі. У пісьме на імя ўчастковай выбарчай камісіі яны прасілі аб'явіць Галіне падзяку за добрую работу.

З кожнай хвілінай весялей у вестыбюлі. На змену баяністу прышоў універсітэцкі духавы аркестр. Пасля дэманстрацыі кіначасопісаў у клубе пачынаецца канцэрт фізіка-матэматычнага факультэта. Выбаршчыкі цёпла сустрэлі выступленне танцавальнага калектыва, які выканаў «Крыжачок» і «Малдаванэску», народныя песні ў выкананні мужчынскага актэта.

Весела ў пакоі для дзяцей. Студэнткі II курса Іра Кісялёва і Эм Грамовіч ветліва сустракаюць малеяькіх гасцей, распранаюць іх, частуюць цукеркамі.

— Як цябе завуць,— пытае Эм ў шустрага хлопчыка, ласкава прыгладжваючы яго непаслухмяныя валасы.

— Віця, Віцёк Пуставалаў,— шчабеча той, а пасля з гордасцю дадае:

— А мой бацька працуе ў ўпраўленні чыгункі...

— Ну, Віцёк, давай я табе пачытаю цікавую казку.

... А ў вестыбюлі весела кліча сябе музыка. Гукі лунаюць, запрашаюць, настойваюць. Пара за парай паддаюцца іх уладзе. І вось яе нястрымана нясуцца па кругу, быццам крыгі ў бурлівую паводкавую ноч. Яны зламаюць усе перашкоды на сваім шляху, бо ў сілы свае цвёрда, непахісна вераць.

А. МАЛЬДЗІС, Т. КРАЧКОЎСКАЯ.

Весела і ўтульна было ў дзіцячым пакоі. Тут малыш адчувае сябе як дома.

***На здымку:** студэнтка І. Кісялёва і аспірантка Н. Клачкова сярод дзяцей выбаршчыкаў.*

Фота Б. Брэйва і Р. Ясінскага

XVIII З'ЕЗД ЛКСМ БЕЛАРУСІ

У абстаноўцы велізарнага палітычнага і працоўнага ўздыму адкрыўся 5 сакавіка XVIII з'езд Ленінскага Комуністычнага Саюза Моладзі Беларусі.

Лепшых сваіх братоў і сясцёр—перадавікоў калгасных палёў і наватараў вытворчасці, выдатнікаў вучобы школ і інстытутаў—паслалі комсамольцы рэспублікі на свой чарговы з'езд. Сярод дэлегатаў—Герой Соцыялістычнай Працы, студэнтка Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі Т. Шкурко, Герой Соцыялістычнай Працы, слухач Гомельскай сельскагаспадарчай школы Савельева, заслужаная артыстка рэспублікі, лаўрэат Сталінскай прэміі Л. Драздова, пісьменнік лаўрэат Сталінскай прэміі І. Шамякін, знатны машыніст Саладкоў і многія, многія другія.

5 сакавіка ў 12 гадзін дня першы сакратар ЦК ЛКСМБ П. М. Машэраў аб'яўляе з'езд адкрытым. Урачыста ўносіцца ў зал пасяджэння сцяг рэспубліканскай комсамольскай арганізацыі.

З'езд ушаноўвае ўставаннем светлую памяць вялікага прадаўжальніка справы В. І. Леніна—І. В. Сталіна.

У справаздачным дакладзе ЦК ЛКСМБ тав. Машэраў падвёў вынікі работы, праведзенай комсамолам рэспублікі пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, указаў на тыя поспехі, якіх дабілася моладзь рэспублікі ў барацьбе за выкананне гістарычных рашэнняў Комуністычнай партыі.

Але і дакладчык, і выступаўшыя ў спрэчках адзначалі, што мы ўсё яшчэ ў сваёй рабоце адстаём ад канкрэтных спраў моладзі, не ведаем яе запатрабаванняў, шмат яшчэ ў нас папернай валакіты, якая перашкаджае працы.

Тав. Машэраў указаў у дакладзе на задачы, якія стаяць перад комсамолам вышэйшых навучальных устаноў. У рэспубліцы працуюць зараз 30 вышэйшых і 121 сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова, у якіх займаецца каля 67 тысяч студэнтаў і навучаючыхся.

—За справаздачны перыяд,—адзначыў дакладчык,—комсамольскія арганізацыі ВНУ сталі больш актыўна

З 5 па 7 сакавіка гэтага года праходзіў XVIII з'езд комсамола Беларусі. Дэлегатам з'езда ад нашай комсамольскай арганізацыі была член камітэта ЛКСМБ універсітэта, аспірантка Н. Хрыпко. Ніжэй мы друкуем артыкул аб рабоце з'езда.

дапамагаць кіраўнікам навучальных устаноў і прафесарска-выкладчыцкаму саставу ў падрыхтоўцы будучых спецыялістаў. Прыкметна павысіўся ўзровень ідэйна-палітычнай работы сярод студэнтаў. Большасць з іх праяўляе вялікую цікавасць да вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі. На жаль,— адзначае П. М. Машэраў,—асобныя комсамольскія арганізацыі яшчэ дрэнна дапамагаюць партыйным арганізацыям, кафедрам грамадскіх навук у глыбокім, творчым вывучэнні студэнтамі марксісцка-ленінскай навукі, слаба вядуць работу па выхаванню студэнтаў у духу высокай комуністычнай свядомасці.

Трэба сказаць, што гэтыя ўказанні ЦК ЛКСМБ поўнасцю адносіцца і да нашай комсамольскай арганізацыі. Вынікі сесіі паказваюць, што яшчэ не ўсе студэнты-комсамольцы універсітэта правільна разумеюць сваю галоўную задачу — глыбока авалодваць ведамі.

З'езд паставіў задачу — узняць выхаваўчую работу комсамольскіх арганізацый ВНУ на ўзровень патрабаванняў, пастаўленых партыяй і ўрадам перад совецкай вышэйшай школай, будаваць сваю работу так, каб кожнае праводзімае мерапрыемства было глыбока змястоўным, садзейнічала пашырэнню кругагляду і ўсебаковаму развіццю будучых спецыялістаў.

Велізарнае ўражанне на мяне, як і на ўсіх прысутных, зрабіла 6 сакавіка сустрэча дэлегатаў з'езда з першым атрадам беларускіх комсамольцаў, ад'язджаючых на асваенне цалінных і абложных зямель у Кустанайскую вобласць. У магутную дэманстрацыю любві да Комуністычнай партыі, совецкага ўрада вылілася гэтая сустрэча.

Дэлегаты з'езда бурнымі апладысментамі віталі слаўных патрыётаў—лепшых сыноў і дачок нашага народа, якія адгукнуліся на заклік партыі і ўрада. Следуючы слаўным баявым традыцыям комсамола, яны абяцалі з'езду быць у першых радах барацьбітоў за ажыццяўленне велічных планаў партыі. Звяртаючыся да ад'язджаючых, сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Машэраў сказаў: «На долю ўсіх вас выпаў вялікі гонар—сваёй самаадданай працай памнажаць комсамольскія баявыя традыцыі, упісаць новую старонку ў слаўны летапіс гераічных спраў нашай совецкай моладзі».

З прывітаннямі выступаюць міністр сельскай гаспадаркі БССР тав. Касцюк, сакратар Мінскага гаркома КПБ тав. Шарапаў, намеснік міністра соўгасаў БССР тав. Лознеў, сакратар ЦК КПБ тав. Аўхімовіч.

Цёпла сустрэтыя дэлегатамі з'езда выступілі ад'язджаючыя на асваенне векавой цаліны маладыя пасланцы комсамола Беларусі — майстра Магілёўскага лакамабільнага завода Владзімір Вараб'ёў, работніца сталеліцейнага цэха Мінскага аўтазавода Тамара Кузняцова, электрык Георгій Кідышка.

Ад школьнікаў сталіцы слова для прывітання прадастаўляецца вучаніцы 9 класа 12 школы Надзі Паходні. Яна [illegible] сваім старэйшым таварышам, якія едуць на новыя землі, шчаслівай дарогі і добрых поспехаў. Пад гром апладысментаў школьнікі падносяць маладым энтузіястам букет кветак.

Работа з'езда закончылася 7 сакавіка. XVIII з'езд комсамола рэспублікі паказаў узросшую актыўнасць комсамольцаў і моладзі рэспублікі, іх гатоўнасць выканаць любое заданне Комуністычнай партыі.

Н. ХРЫПКО,
аспірантка, дэлегат XVIII з'езда ЛКСМБ.

Фельетоны нашых чытачоў

БУРСАЦКІЯ НОРАВЫ

Хрыплы смех А. Кандыбы будзіць мяне. Гляджу на гадзіннік: роўна два.

— Толя, супакойся, не даеш спаць...

— Хочаш спаць—спі,—цынічна ўсміхаецца Кандыба.

— Я не магу пры такім шуме...

— А мне якая справа.

Я кладуся. Але не паспеў закрыць вочы, як нехта кідае ў мяне шапкаю. Праз хвіліну на мяне падае падушка...

— Маладзец, Лёня,—хваліць Кандыба Уварава.

У пакой уваходзіць Жэня Вашкевіч.

— Э, вы яшчэ не спіце?

—Дзе ты быў, брат, а? З дзяўчатамі?—цікавяцца Кандыба і Ураваў.

— Спытайцеся лепш, дзе я не быў: і ў «Мінску» і ў «Беларусі». А якіх дзяўчат там сустрэў — пальчыкі абліжаш...

— Жэнька, разбудзі за нос Казырыцкага. Спытай, спіць ён ноччу ці не,—жартуе Ураваў.

Зноў гучыць рогат: Казырыцкі разбуджан.

Толькі ўсе супакоіліся, як зноў раздаўся стук. У сем гадзін раніцы аднекуль з'явіўся Б. Савіцкі. Ён пачаў займацца гантэллю, некалькі разоў грымнуў ёй аб падлогу. Сон зноў парушан.

Усё гэта адбылося ў ноч з 14 на 15 сакавіка ў 24 пакоі па Маскоўскай вуліцы. І так—з дня ў дзень. А. Кандыба, Е. Вашкевіч, Л. Ураваў і Б. Савіцкі перасталі лічыцца са сваімі таварышамі і не бачаць у сваім бурсацтве нічога дрэннага.

Хто-ж яны?

Студэнт другога курса аддзялення гісторыі Анатолій Кандыба адначасова працуе і старшым піонерважатым 42 школы. У капелюшы, у модным паліто, з павязаным на шыі яркачырвоным шалікам, знешне здаецца вельмі культурным. Лекцыі ён акуратна канспектуе, на калідоры ўступае дзяўчатам дарогу. Але гэта ў яго ўсё знешне. У пакоі ён не лічыцца ні з кім. Яму нічога не каштуе ўключыць радыё, калі ўсе спяць, пабіцца з Е. Вашкевічам, абсыпаць каго-небудзь зубным парашком.

А Леанід Ураваў, прафорг другога курса аддзялення філасофіі, толькі патурае гэтаму бурсаку.

Б. Савіцкі, студэнт другога курса аддзялення рускай мовы, лічыць сябе разумнай, творчай натурай. Але ў пакоі ён вядзе сябе па-хамску. У насценгазеце інтэрната быў змешчан аб ім фельетон. Але Савіцкі ўспрыняў яго як паклёп.

Не, не сапраўдная ў іх культура. Сапраўдная культура праяўляецца не толькі ў пасадцы капелюша на галаве, але і ў дробязях быта.

І. ДЗЕШКО.

НАМ ПІШУЦЬ

На становішчы пасынка

Нядаўна, калі бібліятэка была на некалькі дзён зачынена на рамонт, уесь універсітэт адчуў яе адсутнасць. І гэта невыпадкова. Наша бібліятэка вядзе вялікую і крапатлівую работу і адыгрывае важную ролю ў вучобе студэнтаў. Але чамусьці кіраўнікі універсітэта не ствараюць нам належных умоў для працы і на нашы скаргі звычайна адмоўчваюцца. У разуменні адміністратыўна-гаспадарчай часткі мы нават не вучэбна-дапаможнае прадпрыемства, а «тэхнічны персанал». Ва універсітэце насцілаюць паркет, а ў бібліятэцы не могуць пафарбаваць падлогі. Вокны штогод не замазваюцца да снежня месяца. Летам перашкаджае працаваць сонца, бо няма занавесак. Асвятленне ўбогае: на чатыры сталы адна настольная лямпа.

Праз нашы рукі праходзіць многа грашовых і іншых дакументаў. Але цэлых дзесяць год у нас няма ніводнага стала, які-б замыкаўся на ключ. Усе дакументы мы вымушаны хаваць у папкі для кніг. Дагэтуль, калі студэнты даюць мне свае білеты і пашпарты, я іх хаваю ў кнізе, так што іх без мяне ніхто не можа знайсці. Аднойчы, калі я захварэла, студэнт Нябоська цэлых шэсць дзён не мог атрымаць свой пашпарт.

Восем гадоў нам не купляюць нажніц. Штодзённа неабходны нам лічыльнікі. Дзесяць гадоў мы карыстаемся лічыльнікамі аднаго з супрацоўнікаў. Цеснота ў нас сапраўды страшэнная. Кожны год мы атрымоўваем 17 тысяч кніг, а памяшканне не павялічваецца з 1948 года. Крутая прыстаўная лесвіца вядзе ў пыльнае, душнае памяшканне—«другое кнігасховішча», і бегаць па гэтай лесвіцы многім з нас даводзіцца разоў па 20 на дзень.

А калі нашы нерадзівыя гаспадары пасадзілі ўвесь універсітэт у «халодную», адны памяшканні ацяпляліся лепш, другія горш. Канчатковы крах ацяплення адбыўся ў сакавіку, мы-ж мерзлі і хварэлі ад холаду ўжо са снежня. Мабыць, у мэтах эканоміі паліва ўсю зіму дрэнна ацяпляліся некаторыя памяшканні бібліятэкі.

Калі-ж нам створаць нармальныя ўмовы для працы?

О. Л. НІКАНАВА,
супрацоўнік бібліятэкі.

ДЫПЛОМНАЯ ГАТОВА

У апошнія дні Спартак падоўгу сядзеў у чытальнай зале. Працаваў многа, напружана: блізіўся тэрмін здачы работ. Нарэшце дапісана апошняя старонка. Работа студэнта IV курса геолага-геаграфічнага факультэта Спартака Польскага «Нафтавыя рэсурсы краін Бліжняга і Сярэдняга Усходу і барацьба за іх паміж імперыялістычнымі краінамі» была накіравана на агульнагарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ.

Пытанне нафты, стаўшае ў наш час адным з найбольш вострых палітычных пытанняў, даўно выклікала ў юнака жывую цікавасць. Яе паглыбілі заняткі ў гуртках палітычнай эканоміі і эканамічнай геаграфіі. Да распрацоўкі гэтай тэмы студэнт прыступіў два гады таму назад, яшчэ на III курсе.

Хоць работа і атрымала высокую ацэнку вучонай грамадскасці, але Спартак не быў ёю задаволены. Яму здавалася, што ў рабоце няма дастатковай глыбіні думкі, канкрэтнасці.

Прайшлі дні, месяцы. С. Польскі зноў звярнуўся да захапіўшай яго тэмы. Цяпер гэта была тэма яго дыпломнага сачынення. Студэнт увогуле перапрацаваў тэму. Ён скараціў колькасць раздзелаў, затое закранутым у рабоце пытанням надаў больш глыбокае асвятленне, удакладніў і канкрэтызаваў агульныя палажэнні. Для гэтага Спартаку давялося многа папрацаваць. Ён прачытаў каля трохсот дапаможнікаў, зрабіў мноства выпісак з газет і часопісаў. Чытаў нават мастацкую літаратуру аб нафце.

Сабраны фактычны матэрыял дыпламант старанна абагульніў, абгрунтаваў у жывой і цікавай форме. Работа С. Польскага вызначаецца шырынёй пастаўленай праблемы, цесным перапляценнем пытанняў эканомікі і палітыкі.

Уважліва сачылі і дапамагалі Спартаку кіраўнікі яго работы: спачатку дацэнт кандыдат геаграфічных навук Н. Т. Раманоўскі, прафесар доктар эканамічных навук А. Ю. Шпірт, пасля — прафесар, доктар геолага-мінералагічных навук К. І. Лукашоў.

Не замінала С. Польскаму, а наадварот, вельмі дапамагала грамадская работа. Зараз ён — сакратар комсамольскага бюро геолага-геаграфічнага факультэта, адзін з лепшых спартсменаў факультэта.

Цяпер, калі дыпломная работа ўжо закончана, Спартак Польскі дзейсна рыхтуецца да прадстаячых дзяржаўных экзаменаў.

Т. ВЕНЕДЫКТАВА.

На слядах нашых выступленняў

„Ці такім павінен быць совецкі студэнт"

19 снежня 1953 г. у нашай газеце быў змешчан пад такой назвай артыкул, аўтары якога з абурэннем пісалі аб ганебных паводзінах іх аднакурсніцы Ж. Трэгубовіч.

Камітэт ЛКСМБ універсітэта разгледзеў персанальную справу Ж. Трэгубовіч. Факты, прыведзеныя ў артыкуле, поўнасцю пацвердзіліся. За грубыя парушэнні Статута ВЛКСМ, за цынізм і наплявізм у адносінах да калектыва Ж. Трэгубовіч выключана з радоў ВЛКСМ.

З АПОШНЯЙ ПОШТЫ

У ЗАПАЛЕ КРЫТЫКАНСТВА

Перадавы артыкул апошняга нумара насценнай газеты біёлага-глебавага факультэта «За мичуринскую биологию», прысвечаны Міжнароднаму жаночаму дню, напісан двума аўтарамі—В. Гапоненка і І. Ясінскім.

«Следует упомянуть и о тех,— пісаў Ясінскі,—кто поступил в университет не для того, чтобы **подготовить из себя (!!)** активных строителей коммунистического общества, а для достижения личных интересов Они мечтают о получении образования для себя, окончить университет для того, чтобы потом найти «потеплее местечко» создать домашний уют, отделиться от общества, замкнуться в скорлупу обывателей».

Абвінавачванні сур'ёзныя, тым больш, што Ясінскі ўказаў на двух студэнтак IV курса, як на носьбітаў мяшчанства і кар'ерызма. Такія абвінавачванні патрабуюць абгрунтавання, дастатковай фактычнай аргументацыі, а Ясінскі ў доказ сваіх палажэнняў не прывёў ніводнага факта, лічачы, відаць, што яго слова, слова грамадскага дзеяча, само па сабе з'яўляецца лепшым доказам.

Фактаў Ясінскі і не мог прывесці, бо іх, па сутнасці, не было. Гэта пераканаўча даказаў сход комсамольцаў IV курса, дзе абмяркоўваўся артыкул.

Комсамольцы даказалі таксама Ясінскаму, што крытыканствам аўтарытэт комсамольскага работніка не заваёўваецца, а рэдакцыю газеты «За мичуринскую биологию» пераканалі яшчэ раз у тым, што матэрыялы, пададзеныя ў рэдакцыю, патрэбна дэталёва правяраць.

„Мастацтва належыць народу. Яно павінна ўваходзіць сваімі найглыбейшымі карэннямі ў самую тоўшчу шырокіх працоўных мас. Яно павінна быць зразумела гэтым масам і любіма імі“

(В. І. ЛЕНІН)

★ ★ ★ ★ ★

У гэтым годзе споўнілася 5 год з дня заснавання тэатральнага калектыва Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта імя В. І. Леніна.

ДРУЖНЫ КАЛЕКТЫЎ

Тэатр, сцэна яшчэ з дзяцінства неадаліма вабілі мяне. Ішоў час, цікавасць не аслаблялася, наадварот, кнігі і яшчэ большае знаёмства з тэатрам узмацнялі мару—паспрабаваць свае сілы ў сур'ёзным калектыве.

Першыя крокі былі няўмелымі і няправільнымі. Драматычны гурток універсітэта працаваў тады над яшчэ не апублікаванай п'есай К. Крапівы «Пяюць жаваранкі». Мне была даручана роля Насці Вярбіцкай. Прабавала нясмела. Не клеілася. Прыходзіла расчараванне, нявер'е ў свае сілы... Нямала прышлося папрацаваць са мною і нашаму кіраўніку К. Л. Рутштэйну і кружкоўцам. Чулая падтрымка, сяброўская дапамога, іншы раз і самая суровая крытыка ў многім дапамаглі мне. Ад спектакля да спектакля адчувалася, што іграць становіцца лягчэй, знаходзяцца новыя фарбы для вобраза. Знікла няёмкасць, боязнь гледача, пасля асабліва ўдалых спектакляў было нават і задавальненне.

Вось ужо чацверты год я займаюся ў тэатральным калектыве: гэта цяжкая і цікавая, поўная творчых пошукаў работа. Мне, як будучаму журналісту, удзел у драмгуртку прынёс асабліва вялікую карысць. Іншымі вачыма я стала глядзець на спектаклі, працу актораў. Сачыць не толькі за трактоўкай акторам сцэнічнага вобраза, але і за тым, якімі сродкамі дасягаецца гэта. Прыкмячаеш дробязі, дэталі, на якія раней, напэўна, ніколі не звярнула-б увагі. Безумоўна, сутыкнуўшыся з неабходнасцю напісаць тэатральную рэцэнзію, я не адзін раз добрым словам успамяну наш дружны калектыў.

Н. КАСЬЯНАВА.



Удзельнікі першага спектакля „Мяшчане“.

ЯК Я ПРАЦУЮ НАД РОЛЛЮ

Заняткі ў драматычным калектыве вучаць мяне па-новаму адносіцца да тэатральнага мастацтва, па-новаму ацэньваць ігру актораў, дапамагаюць лепш разбірацца ў кожным творы, вобразе.

Я працую над вобразам Дзіяны Міхайлаўны. Самай вялікай цяжкасцю, з якой я сустрэлася, працуючы над гэтым вобразам, з'яўляецца неадпаведнасць знешніх якасцей паміж мною і гераіняй. Таму асабліва многа трэба працаваць над унутраным паглыбленнем вобраза.

У асэнсаванні вобраза мне вельмі дапамагла біяграфія жонкі Барташэвіча з рамана В. Пановай «Поры года». Але найбольшую карысць прыносіць непасрэднае назіранне людзей у жыцці, такіх людзей, якія асобнымі рысамі нагадваюць гераіню, яе манеры. Часта невялікія дэталі, прыкмечаныя выпадкова ў жыцці, дапамагаюць глыбей раскрыць вобраз.

Нядаўна я зайшла ў атэлье. Маю ўвагу прыцягнула раскошна апранутая дама. Ужо ў паводзінах яе, у манеры гаварыць загадным ладам, не дапускаючы пярэчанняў, я адчула нешта знаёмае. Калі-ж яна там, пры людзях, пачала адчытваць свайго супруга за тое, што машына за ёй прыдзе са спазненнем, я ўжо была ўпэўнена, што гэта — Дзіана Міхайлаўна, хоць можа сапраўднае імя яе іншае. А ўвечары, на рэпетыцыі, я ўжо спрабавала перадаць некаторыя рысы, якія падгледзела ў час гэтай выпадковай сустрэчы.

Так настойліва і крапатліва працуюць над сваімі ролямі ўсе ўдзельнікі спектакля, бо ідэю п'есы можна данесці правільна толькі пры наяўнасці поўнага ансамбля, калі кожны глыбока раскрывае вобраз свайго героя.

Р. МАЛЕНЧАНКА.

НОВЫ СПЕКТАКЛЬ

П'есу для пастаноўкі выбралі не адразу. Адна за другой прапаноўваліся і адхіляліся некалькі рэкамендаваных п'ес. Нарэшце партыйнае бюро універсітэта рэкамендавала кіраўніку нашага тэатральнага калектыва камедыю маладога украінскага драматурга В. Мінко «Не называючы прозвішчаў». Гэтая п'еса адразу прыцягнула ўвагу ўсіх гуртковцаў сваёй вастрынёй, свежасцю.

Пачалася крапатлівая праца над тэкстам, так званы «застольны перыяд», дзе канчаткова высветлілася размеркаванне роляў паміж удзельнікамі. На кожную ролю было прызначана па два выканаўцы.

У час «застольнага перыяда» была праведзена вялікая работа па асэнсаванню тэкста, па раскрыццю ўнутранага жыцця герояў, наладзіліся правільныя ўзаемаадносіны паміж дзеючымі асобамі, заклаліся асновы таго творчага ансамбля, без якога спектакль ніколі не зажывее сапраўдным жыццём.

У гэтым годзе наш калектыў папоўніўся новымі сіламі з ліку студэнтаў першага—другога курсаў, сярод якіх ёсць шмат здольных выканаўцаў. Ім прадстаіць асвоіць і развіць далей тыя традыцыі, якія выпрацаваў наш калектыў за пяць год свайго існавання. Каля паловы ўдзельнікаў спектакля «Не называючы прозвішчаў» першы год працуюць у калектыве. Многія з іх удумліва і настойліва авалодваюць тэатральным майстэрствам.

Намаганні ўсіх удзельнікаў і кіраўніка накіраваны зараз на тое, каб у дзень здачы спектакля — 29 сакавіка—даць сапраўдную творчую справаздачу за ўсе пяць гадоў работы.

Л. ТАМІЛЬЧЫК.

Вялікае задавальненне

Ва універсітэцкі драматычны калектыў я прышла тры гады таму назад. З першых дзён вучобы ва універсітэце я чула многа захапляючых водгукаў аб ігры нашых артыстаў. Мне вельмі захацелася таксама прыняць удзел у жыцці драмкалектыва, хоць я і баялася, што нічога ў мяне не атрымаецца.

Члены калектыва сустрэлі нас, навічкоў, цёпла, ветліва, і шчыра. Я ўжо тады зразумела, што трапіла ў дружную, добрую сям'ю, якая ў многім дапаможа мне, падтрымае, але таксама і многага патрабуе. Каб быць дастойнай гэтай сям'і, мне прышлося многа падумаць, папрацаваць. Першым маім выпрабаваннем была роля Наташы ў п'есе М. Горкага «На дне». Гэты поспех акрыліў мяне.

З тых пор мінула тры гады. Пад кіраўніцтвам нашага рэжысёра Кузьмы Львовіча Рутштэйна і з дапамогаю таварышаў я многаму навучылася. Калектыў навучыў мяне глыбей назіраць жыццё, правільна разумець літаратурныя вобразы, творча ўспрыймаць крытыку гледачоў. Усё гэта вельмі дапаможа мне ў будучай педагагічнай рабоце. Галоўнае-ж, што выхоўвае калектыў,— гэта вялікая патрабавальнасць да сябе, да сваёй ігры, да ігры таварышаў.

Зараз перада мною стаіць сур'ёзная і цяжкая задача—сыграць вобраз Галачкі з камедыі В. Мінко «Не называючы прозвішчаў». Аўтар вельмі скупа намаляваў гэты вобраз, шмат чаго не дасказаў, а мне хочацца, каб Галачка была вясёлай энергічнай, каб яна кахала ўсёй душой, жыла поўным маладым жыццём.

Г. КАНДРАШОВА.

ПЕРШЫЯ КРОКІ

Зімой 1949 года на паседжанні праўлення клуба універсітэта было прынята рашэнне аб'яднаць разрозненыя гурткі факультэтаў у адзіны агульнаўніверсітэцкі драматычны калектыў. Трэба было стварыць такі калектыў, які мог-бы сістэматычна працаваць на працягу некалькіх год, а не ад спектакля да спектакля.

У першы вечар на сход гуртка прышло чалавек пятнаццаць. Збіраліся доўга. Сарамліва падыходзілі да мяне, называлі свае прозвішчы.

— Кармазін.

— Матвееў.

— Шмідава.

Знаёмства пачалося з таго, што кожны чытаў урывак з якога-небудзь твора. Гучэла палымянае слова Маякоўскага, вершы Лермантава, лірычная проза Тургенева.

— З чаго пачнем?— пытаецца нехта, калі скончылася першая праверка.

— З урока.

Усе недаверліва пераглянуліся

— Вы звярталі ўвагу на тое, як вядзе сябе чалавек, які думае, што ён знаходзіцца адзін у пакоі?— пытаюся я.

Безумоўна, усе могуць расказаць аб гэтым. А паказаць? Паспрабавалі. Атрымалася смешна. Вось, здаецца, зусім звычайная рэч: чалавек закурвае, ён павольна дастае партабак, расчыняе яго, не гледзячы бярэ папяросу. Затым усчырквае запалку. Хто з курцоў не рабіў гэтага сотні разоў. Але аказалася, што закурыць, калі на табе сканцэнтравана ўвага многіх людзей, значна цяжэй.

Важна было падрыхтаваць маладых выканаўцаў да таго, каб яны маглі дзейнічаць, жыць на сцэне, дзе за кожным іх словам, жэстам сочаць сотні гледачоў. Няма нічога прасцей у жыцці, чым разглядаць карціну, чытаць кнігу ў звычайных умовах. Але паспрабуйце гэта зрабіць на сцэне і адразу адчуеце звязанасць, няёмкасць. І, як ні дзіўна, вас могуць абвінаваціць у тым, што вы не ўмееце чытаць, разглядаць партрэт.

Нялёгка даваліся першыя крокі. Гурткоўцы рабілі шмат эцюдаў: пілі чай, ігралі на піяніна, шылі; усё гэта, безумоўна, рабілася без стакана, без клавіра, іголкі. Нарэшце, адзін вечар быў прысвечан выдумцы.

— Што-ж мы будзем выдумляць?— смяяліся ўсе.

— Казку! Самую неверагодную казку. Вось вы, Ерохін, пачніце.

— Казку?—здзіўлена перапытвае Раймонд,—якую?

— Сваю.— Раймонд задумаўся.

— Даўным даўно,— пачаў ён,— жылі-былі...

— Дзед і баба,—падказвае нехта з дзяўчат.

— Дзед і баба,—прадаўжае Раймонд,—жылі вельмі бедна, але весела... І казка льецца ўсё свабадней і свабадней. Яна не падобная на чыганыя або чутыя ў дзяцінстве.

— Хопіць, зараз прадаўжайце вы, Люба.

Фантазія расла, шырылася. З кожным новым чалавекам сюжэт усё больш заблытваўся, пакуль нарэшце нечакана хтосьці над дружныя воплескі не завяршыў яго шчаслівай развязкай.

— Скажыце,—дапыталіся ўсе,— а дзеля чаго вам патрэбна выдуманая казка?

— Артыст павінен умець фантазіраваць. Без выдумкі ён заўсёды будзе надта сухім, чорствым.

Падрыхтоўчыя заняткі абагацілі гурткоўцаў ведамі асноў сцэнічнага майстэрства. І разам з тым далі магчымасць атрымаць пэўнае ўяўленне аб здольнасцях кожнага з іх. Але сапраўдная работа пачалася са спектакля.

Выбраць п'есу было цяжка. Праноўвалі самыя разнастайныя. Спыніліся, нарэшце, на «Мяшчанах».

Багатая горкаўская мова, глыбокая рэалістычнасць вобразаў, жыццёвасць, псіхалагічная насычанасць—вось чым прыцягвае да сябе гэтая п'еса.

Пытаюся пасля чыткі: «Ці сустракаў хто з вас людзей, падобных да герояў п'есы?»— Гурткоўцы задумаліся.

— Знаю,— радасна ўскрыкнуў Віктар Кармазін,— калі мы жылі... І пайшлі ўспаміны. Свежыя ўражанні ад вобразаў п'есы пачалі станавіцца больш канкрэтнымі. Ажыў замысел. Аказалася, што тэма мяшчанства і барацьбы з ім зусім не ўстарэлі.

Знаёмства з вялікай творчасцю Горкага, з яго раманамі, апавяданнямі дапамагло гурткоўцам глыбей азнаёміцца з эпохай, у якой адбываецца дзея п'есы.

Праца над п'есай пачынаецца задоўга да выхада на сцэнічную пляцоўку.

Заняткі нельга было абмежаваць вузкімі рамкамі рэпетыцый. Члены гуртка абмяркоўвалі п'есу на перапынках, у вольны час, спрачаліся.

Працавалі ўсе з захапленнем. Ужо той час вызначылася і ўмацавалася адна з выдатнейшых рыс у самадзейным калектыве, якая потым стала найбольш характэрнай для ўдзельнікаў драматычнага калектыва—дружба.

У гэты дзень усе асабліва адчулі, як неабходны тыя якасці, якія рыхтавалі яны ў сабе папярэдняй працай.

Поспех быў поўным. Студэнты цёпла прынялі спектакль маладога калектыва.

Так нарадзіўся новы калектыў нашай самадзейнасці.

Зараз, калі калектыву споўнілася пяць год, калі ён рыхтуе да пастаноўкі новы восьмы спектакль, калі ўдзельнікі яго ўжо сыгралі 70 спектакляў перад студэнтамі, рабочымі, калгаснікамі, байцамі Совецкай Арміі, здаецца не лішнім напомніць, як ствараўся гэты калектыў.

Цёплыя водгукі грамадскасці і крытыкі з'яўляюцца самым дарагім для калектыва, бо яны сведчаць аб тым, што калектыў сваёй працай прыносіць карысць, што ён удзельнічае ў арганізацыі культурнага адпачынку студэнтаў, выкладчыкаў універсітэта, што ён дапамагае партыі ў справе комуністычнага выхавання людзей.

К. РУТШТЭЙН.

УРОКІ МІНУЛАГА ГОДА ЗАБЫТЫ

Як і ў мінулым годзе, на прадстаячы агульнауніверсітэцкі агляд студэнцкіх навуковых работ геолага-геаграфічны факультэт прадстаўляе толькі 15 работ. Гэта вельмі малая лічба для факультэта. Асабліва дрэнна абстаяць справы на аддзяленні геалогіі, якое падрыхтавала ўсяго 6 даследаванняў. У чым-жа прычыны такога становішча?

Факты гавораць, што поспех работы студэнцкага навуковага гуртка залежыць ад таго, колькі ўвагі ўдзяляе ёй кіраўнік гуртка. Напрыклад, гурток эканамічнай геаграфіі, які ў мінулым годзе зусім не ўдзельнічаў у аглядзе, цяпер падрыхтаваў пяць з сямі абмеркаваных на паседжаннях дакладаў. Вялікая заслуга ў адносна добрай рабоце гуртка належыць яго кіраўніку дацэнту Н. Е. Рагозіну, які заўсёды своечасова дапамагае студэнтам падбіраць для дакладаў адпаведную літаратуру, наладжваць цікавыя абмеркаванні.

Зусім інакш абстаяць справы ў гуртках мінералогіі і петраграфіі. За час, які прайшоў з пачатку навучальнага года, у гуртках абмеркавана толькі па аднаму дакладу. Ніякай практычнай дапамогі члены гуртка ад сваіх кіраўнікоў не атрымліваюць. Прафесар Н. І. Накоўнік зусім самаўхіліўся ад работы ў гуртку. У выніку гэтага члены гуртка да агляду прышлі зусім непадрыхтаванымі.

Дрэнна кіруюць навуковай работай студэнтаў Совет СНТ факультэта, комсамольскае і прафсаюзнае бюро. Старшыня Совета аспірант Стэцко—рэдкі госць на факультэце. Мільгане ён перад членамі Совета, паабяцае «наладзіць», «дабіцца» і знікае. За прайшоўшы час ён неяк правёў два паседжанні Совета, але канкрэтных мерапрыемстваў па наладжванню работы гуртkоў не было распрацавана. Гледзячы на свайго кіраўніка, махнулі на ўсё рукой і члены Совета. Некаторыя з іх нават пачалі ўхіляцца ад работы ў гуртках. Так, на віне члена Совета СНТ факультэта студэнта Ерошына сарвалася паседжанне гуртка гістарычнай геалогіі і палеанталогіі.

Некалькі іншы стыль кіраўніцтва навукова-даследчай работай студэнтаў у комсамольскага бюро факультэта. На паседжаннях бюро часта разбіраюцца пытанні навукова-даследчай работы, слухаюцца справаздачы стараст гурткоў, прымаюцца адпаведныя рашэнні. Але ўсе гэтыя рашэнні застаюцца на паперы, бо бюро не кантралюе іх выканання.

Адказная за навукова-даследчую работу бюро Ж. Грабоўская—малавопытны кіраўнік. Ёй патрэбна дапамога, але яна не атрымоўвае яе ні ад Совета СНТ універсітэта, ні ад камітэта комсамола, ні ад прафкома.

Ёсць і другія прычыны, якія адмоўна ўплываюць на стан навукова-даследчай работы студэнтаў факультэта. Студэнты трэцяга курса геалагічнага аддзялення займаюцца не толькі днём, але і ў вячэрнія часы. Практычна атрымоўваецца так, што яны не маюць часу для навукова-даследчай работы. У кабінетах факультэта няма спецыяльнай літаратуры, а бібліятэку імя В. І. Леніна студэнты не маюць магчымасці наведваць. Часта на факультэце можна пачуць, што ўсе недахопы ў навукова-даследчай рабоце тлумачацца тым, што быццам-бы студэнты не хочуць займацца ў гуртках. Гэтае сцвярджэнне абвяргаецца тым фактам, што ў навукова-даследчыя гурткі запісалася да 135 студэнтаў, у тым ліку 46 чалавек з першага і другога курсаў. Трэба толькі арганізаваць іх і стварыць ім неабходныя ўмовы.

Універсітэцкі агляд студэнцкіх навуковых работ набліжаецца з кожным днём. Адчуваючы гэта, захваляваліся і дэкан факультэта, і кіраўнікі гурткоў, і члены комсамольскага і профсаюзнага бюро. Але ўся іх дзейнасць накіравана на тое, каб вылучыць на агляд дыпломныя работы пяцікурснікаў і прапанаваць адпаведным кіруючым таварышам пагаварыць з тымі гуртkоўцамі, чые работы рыхтуюцца да агляду. Ёсць небяспека, што пры такім кіраўніцтве і стылі работы факультэт зноў рызыкуе заняць апошняе месца.

Рэйдавая брыгада газеты «За сталінскія кадры»:
Л. ХЛЕБАВЕЦ, С. КУЦ, студэнткі,
Н. АДАМЧЫК, супрацоўнік газеты.

ДЫСКУСІЯ ПА ПЫТАННЯХ ВІДАЎТВАРЭННЯ

9 сакавіка па ініцыятыве студэнцкіх арганізацый біёлага-глебавага факультэта ў 58 аўдыторыі біякорпуса адбыўся даклад сапраўднага члена АН БССР прафесара Н. В. Турбіна аб дыскусіі па пытаннях віда і відаўтварэння, якая праходзіць зараз на старонках вядучых біялагічных часопісаў. Дыскусію адкрыў «Батанічны журнал», у снежні 1952 г., змясціўшы артыкулы Н. В. Турбіна і Н. Д. Іванова, у якіх падвяргаецца крытыцы вучэнне акадэміка Т. Д. Лысенкі аб відзе і відаўтварэнні. Крытыкі вучэння Т. Д. Лысенкі лічаць, што ён няправільна прыпісвае Дарвіну адмаўленне якасных змяненняў у жывой прыродзе, бо сам-жа Дарвін растлумачыў якасныя разнастайнасці яе і паказаў шляхі паходжання якасна новых форм. Яны паказваюць, што сапраўднае адрозненне паміж эвалюцыйнай тэорыяй Дарвіна і тэорыяй Т. Д. Лысенкі заключаецца ў розным тлумачэнні працэса нарастання якасных змяненняў да ступені відавых адрозненняў. Прафесар Турбін лічыць, што буйныя якасныя змяненні накапліваюцца шляхам дробных змяненняў з патомства ў патомства. Яны вядуць да ўтварэння разнавіднасцей, а затым—відаў. Разнавіднасці разглядаюцца не толькі як форма існавання віда, але і як зачатак новага віда.

У большасці удзельнікаў дыскусіі выклікае сумненне зараджэнне крупінак цел новага віда ў нетрах старога, як гэта імкнецца даказаць акадэмік Лысенка. У доказ правільнасці дарвінаўскай тэорыі паходжання відаў прыводзяцца факты з вобласці сістэматыкі, параўнаўчай анатоміі, эмбрыялогіі, палеанталогіі, геалогіі і інш. Крытыкі Лысенкі ўказваюць на нязначны лік фактаў, якія падцвярджаюць скачкападобны пераход ад аднаго віда да другога без прамежкавых форм, і інакш тлумачаць гэтыя факты. Пры гэтым указваецца, што выпадкі ператварэння маюцца толькі ў раслін, і што «ўтвараюцца» не новыя, а ўжо існуючыя віды. Лічаць, што Лысенка пры водзіць факты, якія магчыма з'яўляюцца вынікам міжвідавога перакрыжавання і ніякіх адносін да відаўтварэння не маюць. Асабліва падкрэсліваецца ігнараванне тэорыяй Т. Д. Лысенкі ролі адбору ў працэсе відаўтварэння.

У дыскусіі прынялі ўдзел многія совецкія вучоныя розных спецыяльнасцей. Цяпер накапліваецца і вывучаецца фактычны матэрыял, які гаворыць як у карысць, так і супраць новай тэорыі відаўтварэння. У сваім дакладзе Н. В. Турбін падвёў першыя вынікі дыскусіі і даў агульны агляд яе з філасофскага і біялагічнага пунктаў гледжання. Ён падкрэсліў значэнне і своечасовасць дыскусіі і адзначыў вялікую цікавасць да яе з боку навуковай грамадскасці. Аўдыторыя, дзе адбыўся даклад, была перапоўнена. Сюды прышлі не толькі студэнты нашага універсітэта, але і студэнты лесатэхнічнага і медыцынскага інстытутаў і навуковыя работнікі Мінска.

Слухачы цёпла сустрэлі Н. В. Турбіна і з вялікай цікавасцю аднесліся да даклада.

У канцы гэтага месяца адбудзецца другі даклад Н. В. Турбіна, у якім будуць разгледжаны навейшыя фактычныя даныя па пытаннях відаўтварэння.

З. САМУСЕНКА.

ТРЫБУНА РЭДАКТАРА НАСЦЕНГАЗЕТЫ

ЯК МЫ РОБІМ ГАЗЕТУ ЦІКАВАЙ

Насценгазета можа прыцягваць увагу чытачоў толькі ў тым выпадку, калі яна іх заінтрыгоўвае, захапляе. А гэта, вядома, залежыць ад таго, наколькі газета з'яўляецца змястоўнай, жывой, як адлюстроўвае яна надзённыя пытанні, як яна афармлена і г. д.

Поўнасцю адлюстроўваць жыццё курса, расказваць аб рабоце студэнтаў, высмейваць усё дрэннае, якое яшчэ захавалася ў паводзінах асобных студэнтаў,—такую задачу ставіць перад сабою рэдкалегія насцен газеты «Голас журналіста». Гэта з'яўляецца галоўным у рабоце і аб гэтым ні ў якім разе нельга забываць

Зрабіць газету за некалькі гадзін немагчыма. На падрыхтоўку матэрыялаў неабходна многа часу. А пагэтаму толькі цесная сувязь з жыццём курса, з актывам газеты дазваляе вызначыць тое, на што асабліва неабходна звярнуць увагу, і своечасова арганізаваць патрэбны матэрыял: ці проста заметку, ці замалёўку, ці нарыс.

Чым займаецца рэдкалегія газеты перад выпускам чарговага нумару? Арганізацыяй матэрыялаў, планаваннем тэматыкі нумару. Падбіраючы людзей, якія добра знаёмы з тымі ці іншымі фактамі, рэдактар дае даручэнне напісаць аб гэтым, указваючы на вартасць матэрыялу і форму яго падачы, на пытанні, якія заслугоўваюць асаблівай увагі.

Падбор чалавека, які змог-бы аб'ектыўна падыйсці да ацэнкі факта, да правільнага яго асвятлення, мае таксама вялікае значэнне. Трэба, каб аўтар сказаў аб гэтым проста, ясна і цікава. Так, напрыклад, у час зімовай экзаменацыйнай сесіі Я. Крыскавец па-сяброўску дапамагаў сваім таварышам паўтараць матэрыял. Рэдкалегія не магла прайсці міма гэтага факта, і ў газеце быў змешчаны матэрыял Г. Зотава «З новым семестрам, Жэня!».

На старонках газеты лепшыя студэнты дзеляцца вопытам падрыхтоўкі да экзаменаў, расказваюць аб сваёй вучобе, адпачынку, дзеляцца ўражаннямі аб прайшоўшай практыцы.

Каб не зрабіць газету, як кажуць, аднабокай, выкарыстоўваецца разнастайная тэматыка, пашыраюцца жанры матэрыялаў. На старонках нашай газеты друкуюцца матэрыялы рознага характару: артыкулы кароткія апавяданні, вершы, рэпартажы, фельетоны, эпіграмы, аб'явы Газета толькі выйграла ад таго, што змясціла апавяданні Я. Крыскаўца, рэпартаж В. Хорсуна «На калгасных гонях», «Рэпартаж з лекцыі» В. Чаргейкі, вершы Г. Зотава. А. Вярцінскага, А. Харкевіча і інш.

Матэрыялы, у якіх высмейваюцца дрэнныя рысы ў паводзінах нашых студэнтаў, часцей за ўсё змяшчаюцца пад загалоўкамі «Выбачайце, калі ласка», «Аб'явы». Гэтую-ж функцыю нясуць эпіграмы, фельетоны.

Мы дабіваемся рэагавання на кожнае крытычнае выступленне газеты ад комсамольскага бюро ці схода.

Не меншае значэнне надаем мы і мастацкаму афармленню газеты: загалоўкам, карыкатурам. Але ўсё гэта падпарадкоўваецца аднаму — змястоўнасці.

Газета наша не пазбаўлена і недахопаў. Бывае, што ў ёй змяшчаюцца няпоўнацэнныя, сырыя матэрыялы. Апошні нумар нядбайна афармлены, іншы раз няправільна размяшчаецца матэрыял.

В. КАЛІНОЎСКІ, рэдактар насценнай газеты III курса аддзялення журналістыкі.

ПАМЯЦІ Т. Г. ШЭЎЧЭНКІ

Совецкая моладзь добра ведае і горача любіць творчасць вядомага ўсяму свету украінскага паэта Тараса Грыгоравіча Шэўчэнкі.

Нядаўна совецкая грамадскасць адзначыла 140 год з дня нараджэння Т. Г. Шэўчэнкі.

У чытальнай зале нашага універсітэта кандыдат філалагічных навук В. М. Цімафеева зрабіла даклад аб жыцці і творчай дзейнасці песняра рэвалюцыйнай дэмакратыі Т. Г. Шэўчэнкі, аб цеснай сувязі яго творчасці з рэвалюцыйнай рускай думкай таго часу, аб неўміручасці яго паэзіі ў наш час.

Работнікі бібліятэкі і чытальнай залы арганізавалі змястоўную выстаўку твораў Т. Г. Шэўчэнкі і прац літаратуразнаўцаў, напісаных аб яго творчасці, а таксама фотавітрыну, на якой змешчаны фотаздымкі карцін рускіх мастакоў аб поўным драматызме жыцця аўтара «Кабзара».

У батанічным садзе

Хутка набліжаюцца цёплыя вясенніе дні. Работнікі батанічнага сада універсітэта дзейсна рыхтуюцца да веснавых насадачных работ. Праводзіцца адборка раслін, праверка іх на ўзыходжасць.

Апрача гэтага батанічны сад мае цесную сувязь з навукова-даследчымі ўстановамі, школамі, садаводствамі рэспублікі і ўсяго Саюза. Зараз туды з батанічнага саду адпраўляюць многа насення разнастайных кармавых, маслічных, меданосных і іншых раслінных культур. Вялікую дапамогу аказваюць работнікі батанічнага саду насеннем злакаў і тэхнічных культур пад шэфнаму калгасу Дзержынскага раёна. Адсюль таксама ідзе дапаможны матэрыял для вучэбных мэт на біёлага-глебавым факультэце.

Аб дружбе вялікай

Народы Совецкага Саюза з вялікай любоўю і пашанай адносяцца да вялікага рускага народа—свайго старэйшага брата і друга. Толькі з дапамогай вялікага рускага народа беларусы і украінцы вызваліліся з-пад гнёту польскіх паноў і цяпер будуюць свабоднае жыццё.

У вышаўшай нядаўна ў Дзяржаўным выдавецтве БССР кніжцы дацэнта нашага універсітэта Л. С. Абецэдарскага «Барацьба украінскага і беларускага народаў за ўз'яднанне з Расіяй у сярэдзіне XVII века» ярка паказана, што непарушная дружба брацкіх народаў мае глыбокія гістарычныя карэнні. У XVI—XVII стагоддзях, калі землі Украіны і Беларусі аказаліся ў саставе Рэчы Паспалітай, Руская дзяржава была надзейнай апорай украінцаў і беларусаў у іх барацьбе з літоўскімі і польскімі феадаламі. Удзельнікі народных паўстанняў, якія выклікаліся бязлітаснай эксплуатацыяй з боку захопнікаў, заўсёды імкнуліся да аб'яднання з брацкім рускім народам.

Аўтара працы найбольш цікавіць сярэдзіна XVII стагоддзя, калі барацьба народных мас супраць феадальна-прыгонніцкага і нацыянальна-рэлігійнага гнёту набыла асабліва вялікі размах. У 1648 годзе, калі Багдан Хмельніцкі стаў на чале запарожскага казацтва, пачалося народнае паўстанне на Украіне. Яно ахапіла амаль усю тэрыторыю Беларусі. Хмельніцкі пасылаў на дапамогу беларускаму народу казацкія атрады, вакол якіх групіраваліся паўстаўшыя сяляне і гарадская беднята. Паўстанне ў Беларусі мела вялікае значэнне ў ходзе вызваленчай барацьбы украінскага народа. Мужнасць паўстаўшых жыхароў Пінска, гераічная абарона Мазыра і Бабруйска, бітва пад Лоевам затрымалі падрыхтаванае Радзівілам наступленне атрадаў польскай шляхты на Украіну цераз беларускія землі і тым самым далі магчымасць Хмельніцкаму сабрацца з сіламі і дабіцца раду перамог, дапамаглі украінскаму народу ў 1654 годзе ўз'яднацца з Расіяй.

Толькі ў канцы XVIII стагоддзя барацьба беларускага народа за ўз'яднанне з Расіяй закончылася поспехам. Загартаваная ў гэтай барацьбе дружба брацкіх народаў мацнее з кожным днём.

У працы Л. С. Абецэдарскага на канкрэтных прыкладах паказана гартаванне брацкай дружбы. Напісаная даступнай мовай, кніжка безумоўна прыцягне ўвагу чытача. Актуальнасць і важнасць яе ўзмацняецца тым, што яна вышла ў дні, калі народы Совецкай краіны адзначаюць 300-годдзе ўз'яднання Украіны з Расіяй.

М. АДАМАЎ.

ПАПРАЎКА

У апублікаванай у № 4 (190) нашай газеты заметцы „Энтузіясты бібліятэчнай справы" па віне аўтара дапушчаны недакладнасці. Так, Паліна Навумаўна Херуза не выдае кніг, а працуе на каталозе. Радок „Бібліятэка зараз займае адно з лепшых памяшканняў" не адпавядае сапраўднасці.

Рэдактар А. ВОЛК.

АТ 05240 Мінск друк. БДУ, універсітэцкі гарадок. Тыраж 1000 Заказ 197